

**Учреждение образования «Пинский государственный аграрно-технический колледж имени А. Е. Клещёва»**

*Инна Евтух, преподаватель русского языка и литературы*
*Анастасия Ульянова, учащаяся группы 131Б специальности «Мелиорация и водное хозяйство»*

Стойте! Посидите рядышком со мной
И поговорите со своей душой…

Планы мы строим сегодня на завтра.
А что есть сейчас? Это ведь невозвратно…

Мы так бежим, словно в гонке извечной,
Что пропускаем прекрасные встречи.

Мы пропускаем людей без улыбки,
Сделавших в жизни большие ошибки.

Мы пропускаем закаты, рассветы,
Ставим себе бесконечно запреты.

Думаем, время течёт бесконечно…
Только поймёшь ты: оно скоротечно!

С грустью на сердце ты вспомнишь былое:
Первый восход, поцелуй, шум прибоя.

Ценить мы должны все мгновенья и встречи.
Теперешний миг так прекрасен, беспечен.

Что там впереди – неподвластно раздумьям.
Всё в наших руках! Ты – творец! Будь безумным!

Позволь себе жить иногда с остановкой,
Позволь себе хоть небольшую обновку.

И не потому, чтобы в этом нуждался,
А просто, чтоб чаще себе улыбался!

Учись замечать неприметное рядом
И проще порой относиться к преградам.

А чтобы общеньем тебе наслаждаться,
Учись быть приветливым, чаще смеяться!

Пусть яркими красками жизнь заиграет
И взгляд ежедневно от счастья сияет!

***

Я крочу далей, у пакой «Сялянская хата» з рэчамі сялянскага побыту. Пераходзячы ў гэты пакой, я не утрымалася і падняла стары званочак, якім, відаць, пачынаўся занятак Якуба Коласа. Першае, на што я звяртаю ўвагу, – печ – душа сялянскай хаты. Ля печы стаіць качарга, вілачнік, драўляная лапата. Побач – ступа з таўкачом, ручныя жорны і многія другія рэчы, якія вяртаюць да жыцця страчаную спадчыну беларусаў. Спадчыну нашага мінулага, нашай памяці.

Праца настаўніка на Палессі, сустрэчы з рознымі людзьмі, блізкае знаёмства з цяжкім становішчам палешукоў, захапленне іх душэўным хараством – усё гэта прыцягвала ўвагу Якуба Коласа і было тэмай для трылогіі «На ростанях». Прачытаўшы назву твора, я ўяўляю постаць вандроўніка, які стаіць на перакрыжаванні дарог у роздуме аб сваім жыцці. Малады настаўнік Лабановіч не ведае, дзе ж яна, гэта дарога, але ўпэўнены, што яна ёсць: «Шмат на гэтай дарозе ям і калдобін, розных патырчак і злыдняў. Але калі ты чэсны і свядомы чалавек і перад табою паўстаюць цяжкасці, уразумей іх сваім розумам і адчай сэрцам, не бойся, не адступай ад праўды, і ніколі, ні пры якіх умовах, не пагаджайся з тымі, хто зневажае народ, чыніць здзекі. Не паддавайся ні на якія спакусы і абяцанні, накіраваныя на крыўду народа».

Вельмі шмат мясцін на Палессі, якія звязаны з песняром беларускага народа, з песняром сонца, святла, радасці, гармоніі.

Пінкавічы... Дарагі куточак зямлі, над якім і сёння, як і стагоддзі назад кружаць беларускія птушкі. Тут блакітныя рэкі і дзіўныя азёры, запаведныя лясныя дубровы, непаўторныя бярозавыя гаі. Гэта багаты і шчодры куточак зямлі.

Калі тут апынешся хоць раз – ніколі яе не забудзеш, бо калі з чыстага крынічнага калодзежа, з якога чэрпаў ваду Якуб Колас, вып'еш глыток сцюдзёнай празрыстай вады – прыбавіцца сілы і радасці.

Я раю ўсім, хто любіць творчасць Якуба Коласа, наведаць гэты цудоўны куточак роднага краю. Той, хто наведае «Коласаву школу», атрымае духоўнае ачышчэнне і супакаенне.

*Тут людзі незвычайнай прыгажосці*
*Сярод лясоў і рэк жывуць вякамі,*
*Хто завітае на Палессе ў госці –*
*Багаты будзе вернымі сябрамі.*



***Вольга Палаўко**, выкладчык*
***Анастасія Ул'янава**, навучэнка*

## «Коласава школа» ў Пінкавічах

Два каласы – дзве праўдзівыя песні!
Поплеч, як сёстры ідуць у свет…
Колькі вы радасці людзям прынеслі,
Колас жытнёвы і Колас – паэт!
*Р.Томала*

Даведаўшыся ад выкладчыка пра экскурсію ў народны краязнаўчы музей Якуба Коласа ў Пінкавічах, я была незвычайна здзіўлена і вельмі ўражана, бо ўявіць сябе чалавекам без гісторыі, без памяці, без сувязей з роднай зямлёй немагчыма.

Сёння я запрашаю вас прайсці сцежкамі памяці таго дня, прыгадаць спадчыну Я. Коласа ў Пінкавічах.

У той дзень было цудоўнае надвор'е: сонца свяціла ярка-ярка. Прыгожа прыбраны невялікі двор вылучаўся сярод іншых сваёй незвычайнасцю і загадкавасцю. Вось невялікі драўляны будынак школкі, куды на пачатку мінулага стагоддзя прыехаў жыць і працаваць малады настаўнік, будучы класік беларускай літаратуры Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч. На ганку музея экскурсавод Жанна Мікалаеўна нас сустрэла песняй «Беларуская мова» ў выкананні гурта «Дразды». Пасля праслухоўвання песні я нейкі час не магла сысці з месца, бо была ў задуменні, шукаючы адказ на пытанне, чаму мы, беларусы, так мала гаворым на сваёй роднай мове? Чаму, калі беларуская мова з'яўляецца дзяржаўнай, чаму свае думкі выказваем на

іншых мовах, вывучаем іх дасканала, калі наша родная беларуская мова – гэта бабуліна казка, матуліна ласка, хлеб на чыстым абрусе, душа Беларусі!.. Не толькі мяне турбавала гэта пытанне, але і Якуба Коласа, які ўсё жыццё шукаў адказ на гэтае пытанне, але так і не знайшоў.

Вось Жанна Мікалаеўна звяртае нашу ўвагу на сваё самае любімае дрэва – бярозку, лісце якой ужо пажаўцела і паволі пачало ападаць. Чаму любімае дрэва, запытаеце вы? Менавіта гэтую бярозку пасадзіў у 1972 годзе брат паэта Іосіф Міхайлавіч Міцкевіч. У гонар памяці тых часоў, калі ён, разам з братам Міхаськам, прыехаў у Пінкавічы з Мікалаеўшчыны да брата Канстанціна жыць і вучыцца, таму што памёр бацька хлопчыкаў.

Заходзім у музей. Пры ўваходзе ў вестыбюль першае, што ўразіла мяне, кінулася ў вочы, засталося ў маіх успамінах – бюст паэта ў сталым узросце, бюст мудрага, свабоднага, добрага, шчырага, спагадлівага, ветлівага, справядлівага песняра роднай зямлі. Ён глядзеў на мяне з павагай, быццам бы звяртаўся са словамі: толькі ў змаганні з усімі нягодамі жыцця можна знайсці свой шлях, толькі сваёй сілай можна выканаць сваю долю.

І неяк нечакана Жанна Мікалаеўна абрывае мае думкі. Чытае верш і тлумачыць, што менавіта ў вёсцы Пінкавічы Якуб Колас напісаў дваццаць вершаў з паметкай «село Пинкавичи»:

*А было ж у тыя дні*
*Прыехаў Колас на кані.*
*Азірнуўся ён наўкола*
*І сказаў: "Вось гэта школа,*
*Проста царскія палацы*
*І вёска, як не любавацца!*
*Вунь рака, а там балота,*
*Вось плантацыя чарота.*
*Толькі крок ступіў я першы,*
*А душа ўжо піша вершы".*

Тут, у палескай глушы, паэт убачыў рэальныя жыццёвыя абставіны жыхароў вёскі. Яго балюча кранае беднасць і адсталасць палешукоў, сацыяльная несправядлівасць. Чаму так пакутуе народ? Як аблягчыць яго пакуты? Гэтыя пытанні не давалі спакою сціпламу маладому настаўніку, і ён вырашае пазнаць праўду, знайсці сваё месца ў змаганні за свабоду роднага народа і ставіць перад сабой задачу: усімі сіламі, усім сэрцам служыць працоўнаму народу. Так ён і зрабіў. У час настаўніцтва на Палессі Якуб Колас уважліва сочыць за падзеямі ў краіне. У лістападзе 1905 года прымае ўдзел у сялянскіх хваляваннях, у выступленні сялян вёскі Пінкавічы супраць памешчыка Скірмунта, які адабраў у іх зямлю. А які ж ён быў разумны і адукаваны чалавек! Якуб Колас піша ліст да памешчыка ад імя сялян. Жыхары вёскі па прапанове паэта ў гэтым пісьме ставяць подпісы па кругу, падпісваюцца так, каб Скірмунт не дазнаўся, хто першы паставіў подпіс. З-за гэтага Якуба Коласа выганяюць са школы і аддаюць пад нагляд паліцыі.